# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА В. А. ВЯРБІЦКАГА



**В. А. Вярбіцкі, кіраўнік групы**

**Перыяд дзеяння:**

жнівень 1941 г. – красавік 1943 г.

**Месца дзеяння:**

раён Маркаўшчына г. Віцебска

**Колькасць:**

33 чалавекі

**Кіраўнікі:**

Вярбіцкі Васіль Аляксеевіч

Дзейнічала са жніўня 1941 г. да красавіка 1943 г. Разведвальна-дыверсійная група была створана камуністамі В. А. Вярбіцкім і Г. П. Бурлаковым, пакінутымі ў Віцебску для падпольнай работы, налічвала 33 чалавекі.

З вясны 1942 г. працавала пад кіраўніцтвам аператыўна-чэкісцкай групы А. П. Максіменкі. Пазней устаноўлена сувязь з адказным арганізатарам падпольнага абкама КП(б)Б па Віцебску В. Р. Кудзінавым і партызанскімі атрадамі М. Ф. Біруліна і Д. Ф. Райцава, якія дзейнічалі на тэрыторыі Віцебскай вобласці. Сярод падпольшчыкаў гэтай групы былі камуністы А. М. Міхайлоўская, З. П. Ражкова, А. Ц. Окунеў, У. У. Жукаў, В. Лук’яненка, камсамольцы М. Н. Вінакураў, Л. Я. Шчаглова, У. Забаранкаў, сёстры М. І. і А. І. Старавойтавы. У распаўсюджванні савецкіх лістовак актыўна ўдзельнічаў піянер Саша Багданаў. Адказныя заданні выконвалі А. Ф. Разумоўскі, А. Ф. Юшкевіч, П. Ф. Іваноў, М. В. Лапуноў і інш.

На працягу амаль двух гадоў група вяла разведку, антыфашысцкую прапаганду, пастаўляла партызанам зброю, боепрыпасы, медыкаменты, забяспечвала дакументамі, накіроўвала ваеннапалонных і жыхароў горада да партызан. Патрыёты наладзілі масавы вынас зброі са склада армейскага корпуса ворага. Толькі за 2 першыя месяцы 1943 г. яны даставілі ў партызанскія атрады каля 4 тыс. патронаў, 20 ручных гранат, 6 кг узрыўчаткі, кулямёт, некалькі пісталетаў, 2 пісталеты-кулямёты.

Асабліва шмат зброі і боепрыпасаў здабылі М. Н. Вінакураў, М. В. Лапуноў, В. Лук’яненка, Л. Я. Шчаглова. П. Ф. Іваноў па частках вынес, сабраў і перадаў партызанам 7 аўтаматаў. Медыкаменты паступалі ад сясцёр Старавойтавых, якія працавалі ў аптэцы. Муж і жонка Юшкевічы і А. М. Міхайлоўская захоўвалі ў сваім доме радыёпрыёмнікі, слухалі зводкі і забяспечвалі супольнікаў прапагандысцкім матэрыялам, хавалі ваеннапалонных і перапраўлялі іх да партызан.

Вярбіцкага, як і многія іншыя падпольныя групы горада, страціла сувязь са сваім кіраўніцтвам. У красавіку 1943 г. гітлераўцы арыштавалі 30 удзельнікаў падполля. У час вобыску на канспіратыўнай кватэры ў А. М. Казловай па вуліцы 1-й Украінскай, 5, дзе жыў Вярбіцкі, была знойдзена скрынка з узрыўчаткай, пісталет і 7 ручных гранат. 18 падпольшчыкаў, у тым ліку ўсе камуністы, а таксама М. Н. Вінакураў, У. Забаранкаў, П. Ф. Іваноў, М. Лавігін, М. В. Лапуноў, Д. А. Літвінаў, М. Малічаў, К. Меньшыкава, Л. Я. Шчаглова, А. Ф. Юшкевіч расстраляны. 13 членаў групы адпраўлены ў лагер СД.

Вярбіцкі і Бурлакоў удастоены медалёў «За адвагу», і толькі 7 удзельнікаў гэтай групы атрымалі ўзнагароды.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група В. А. Вярбіцкага / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 483–484.